**Матырка, В.** Знак вечнай памяці / В. Матырка // Лепельскі край. — 2009. — 2 ліп. — С. 7.

## ЗНАК ВЕЧНАЙ ПАМЯЦІ

Паставіць помнік воінам-«афганцам» было даўнай задумай раённых арганізацый Саюза ветэранаў вайны ў Афганістане і Саюза афіцэраў. Так склалася, што Заслонаўская пярвічка афганцаў самая вялікая ў раёне – больш 30 чалавек. У мінулым годзе намаганнямі іх кіраўнікоў Сяргея Крывяля і Віталя Франчука справа нарэшце атрымала належны імпульс і зрушылася з мёртвай кропкі.

Грошы на помнік збіралі ўсім мірам, хто колькі можа. Адным з першых свой уклад унёс камандзір 19 механізіраванай брыгады палкоўнік Уладзімір Бобрык. Помнік з чорнага мармуру коштам паўтара мільёна рублёў вырабілі ў Віцебску.

Самым дзейсным чынам дапамагло ДРБУ-202 пад кіраўніцтвам майстра Сяргея Шляжко, які ў свой час таксама служыў у Афганістане, брыгада работнікаў прадпрыемства звозіла камяні, ладкавала кампазіцыю, праводзіла добраўпарадкаванне прылеглай тэрэторыі. Атрымалася выдатна. Камяні сімвалізуюць горы, дзе нашы хлопцы пад палючым сонцам неслі сваю цяжкую службу там, куды іх накіравала Радзіма. Крыж – сімвал ахвярнасці, а чорная пліта – даніна нашай памяці і павагі тым, хто прайшоў праз выпрабаванні, не зламіўся, не зганьбаваў высокага звання савецкага салдата.

У суботу ва ўрачыстай абстаноўцы помнік быў адкрыты. На мерапрыемства сабралася амаль усё насельніцтва Заслонава. На мітынгу выступілі начальнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама Ігар Урбан, дырэктар Заслонаўскай школы Таццяна Іванова, палкоўнік Уладзімір Бобрык. Таксама сіламі самадзейных артыстаў быў пастаўлены канцэрт, а завяршылася ўсё народнымі гуляннямі. Для прысутных былі арганізаваны частаванне салдацкай кашай з паходнай кухні, спаборніцтвы па шахматах, армрэстлінгу, перацягванні каната.

**В. Матырка**